WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

14 СТУДЗЕНЯ 2012 г. СУБОТА
№ 8 (27123)
Кошт 800 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## У НОВЫМ ГОДЗЕ — НОВЫЯ МЕРЫ ПАДТРЫМКІ СЕМ'ЯЎ З ДЗЕЦЬМІ

**З наступнага месяца пачнецца выплата дапамог асобным катэгорыям грамадзян у новых памерах. Адначасова будзе праведзена выплата розніцы паміж новым памерам дапамогі і фактычна выплачаным у студзені.**

Гэта звязана з тым, што, у адпаведнасці з Указам № 616 «Аб узмацненні сацыяльнай падтрымкі асобных катэгорый грамадзян», з 1 студзеня павышаны памеры дапамог асобным катэгорыям грамадзян адносна бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.

Так, дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў павялічана з 65% да 100% БПМ і складае 574 тыс. 790 руб. Дапамога на дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека, павялічана з 45% да 70% БПМ і складае 402 тыс. 350 руб. Дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады, узрасла з 30% да 50% БПМ і складае 287 тыс. 400 руб. (з надбаўкай 40% — 402 тыс. 350 руб.).

**Да ўвагі**

***У параўнанні з 2010 годам сярэднямесячны памер дапамогі на дзяцей да 3-х гадоў і старэй 3-х гадоў за 2011 год вырас на 46,1%.***

***З 1 кастрычніка мінулага года ў два разы павялічаны памер аднаразовай дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці: пры нараджэнні першага дзіцяці — з 5 да 10 БПМ (на 1 снежня гэта 5 747 900 руб.); пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — з 7 да 14 БПМ (8 047 060 руб.).***

Акрамя таго, паводле інфармацыі ўпраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, сёлета разлік штомесячных дапамог па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3-х гадоў будзе ўвязаны з сярэдняй зарплатай па краіне і складзе пры нараджэнні першага дзіцяці — да 35% сярэдняй зарплаты па краіне; пры нараджэнні другога — да 40%.

### Дзеці першых двух гадоў жыцця будуць бясплатна забяспечвацца прадуктамі харчавання

Распрацаваны праект указа, накіраванага на ўдасканаленне механізму дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі (ДАСД), які ўтрымлівае гэтую меру.

Як паведамілі нам ва ўпраўленні народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, на дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу ў выглядзе бясплатнага забеспячэння прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця будуць мець права сем'і, сярэднедушавы даход якіх ніжэй за крытэрый наяўнасці патрэбы (такім з'яўляецца бюджэт пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва — БПМ). Сярэднедушавы даход сям'і будзе вызначацца, зыходзячы з даходаў, атрыманых членамі сям'і на працягу 12 месяцаў, якія папярэднічаюць месяцу звароту па дзяржаўную падтрымку ў такой форме.

Пры нараджэнні двайнят і больш дзяцей права на бясплатнае харчаванне плануецца прадастаўляць сем'ям без уліку ўзроўню даходаў (цяпер на гэта маюць права сем'і пры нараджэнні трайнят і больш дзяцей). Мяркуецца, што такія меры стануць істотнай падтрымкай для бюджэту сем'яў, якія маюць малалетніх дзяцей.

**Святлана БУСЬКО.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

г. Мінск

## РОЗГАЛАС
АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### НОВЫЯ АЎТОБУСЫ Ў МАГІЛЁВЕ

**На маршрутах грамадскага транспарту ў Магілёве з'явілася 17 новых аўтобусаў, якія набыты за бюджэтныя сродкі.**

Аўтобусы «МАЗ», якія маюць вялікую і асабліва вялікую ўмяшчальнасць, даверылі лепшым вадзіцелям Магілёўскага аўтобуснага парка № 1. Сёння гэта транспартная арганізацыя забяспечвае амаль паўсотні маршрутаў. У асноўным новыя аўтобусы працуюць на маршрутах, якія звязваюць з цэнтрам горада аддаленыя мікраёны, у прыватнасці, новы «Спадарожнік».

**Ілона ІВАНОВА.**

### ІНКАСАТАРЫ ПАТРАПІЛІ Ў АВАРЫЮ

**Гэтае дарожна-транспартнае здарэнне адбылося ўчора ў Мінску ў 9.15 раніцы.**

— Інкасатарскі «Фальксваген Транспарцёр» рухаўся па вуліцы Ціміразева на вуліцу Ігнаценкі па трэцяй паласе. Вадзіцель у нейкі момант не справіўся з кіраваннем і ўвайшоў у занос. Аўтамабіль выскачыў на паласу сустрэчнага руху і на другой паласе сутыкнуўся з аўтамабілем «Пежо Баксёр», — распавяла «Звяздзе» падрабязнасці здарэння старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе аддзела ДАІ Цэнтральнага РУУС г. Мінска Настасся Цыбіна. — У выніку дарожна-транспартнага здарэння кіроўцу інкасатарскай машыны і пасажыра выкінула з транспартнага сродку на асфальт. Яны былі шпіталізаваныя ў бальніцу. Пасажыр пацярпеў у большай ступені.

Як паведаміла далей суразмоўца, кіроўца аўтамабіля «Пежо Баксёр» не пацярпеў. Аднак саму машыну пасля сутыкнення выкінула ў бок тратуара, дзе яна наляцела на «Фальксваген B5». Зараз праводзіцца праверка абставін здарэння. Мяркуецца, што на дарозе быў галалёд, і з гэтай прычыны кіроўца інкасатарскай машыны не справіўся з кіраваннем.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ДУРНЫЯ ЖАРТЫ Ў МЕТРО

**Міліцыя праводзіць праверку па інцыдэнце з распыленнем газу ў мінскім метро, паведамілі БЕЛТА ў ГУУС Мінгарвыканкама.**

12 студзеня каля 20.40 хвілін ад дыспетчара Мінскага метрапалітэна паступіла паведамленне аб тым, што на станцыі «Плошча Перамогі» ў чацвёртым вагоне электрацягніка адчуваецца пах газу. Як расказалі пасажыры, невядомы распыліў газ з балончыка, пасля чаго ўцёк. Аднак тады ніхто не паскардзіўся на кепскае самаадчуванне. Міліцыя і машыніст агледзелі вагон, і электрацягнік прадоўжыў рух.

Акрамя таго, каля 21.40 у той жа дзень у міліцыю паступіла паведамленне, што на прыпынку грамадскага транспарту каля гандлёвага цэнтра «Карона» жанчына просіць дапамогі. Настаўніца адной са школ патлумачыла, што яна з вучнямі трэцяга класа вярталася з тэатра, і на станцыі метро «Плошча Перамогі» вучні адчулі непрыемны пах. Пасля гэтага настаўніца з дзецьмі выйшла з метро і прадоўжылі шлях на наземным грамадскім транспарце. У аўтобусе ў некаторых дзяцей самаадчуванне пагоршылася. Чацвёра дзяцей былі дастаўлены ў бальніцу.

**Кар. БЕЛТА.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

Фінансавы тыдзень

## ДОЛАР ПАТАННЕЎ, А РАСІЙСКІ РУБЕЛЬ ВЯРНУЎСЯ З «АДПАЧЫНКУ»

**Учора была пятніца, трынаццатае... І, дарэчы, Новы год. Стары. Для тых, хто лічыць 2012-ты годам апакаліпсісу, — не вельмі добры, напэўна, знак. Затое аптымісты могуць цяпер сябе ўжо дакладна адчуваць у новым годзе. Які мае ўсе шанцы быць для свету калі не канцавым, то, верагодна, цяжкім, як і папярэдні.**

«У 2008 годзе банкі былі выратаваны ўрадамі. Пытанне, якое дамінавала ў 2011-м, — як выратаваць урады...». Гэта даслоўная цытата з навагодняга нумара часопіса «The Economist». А на Каляды генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун заявіў, што, на яго думку, 2012 год будзе яшчэ больш цяжкім для свету, чым мінулы. Ды і ўвогуле, многія сцвярджаюць, што эканамічныя праблемы будуць працягвацца. Як паведаміла расійская медыякампанія «РБК», японскі інвестыцыйны банк Nomura ацаніў асноўныя геапалітычныя рызыкі на год Чорнага Дракона. Для сусветнай эканомікі могуць мець наступствы такія падзеі: прэзідэнцкія выбары ў Расіі, якія вельмі турбуюць замежных інвестараў і заходнія ўрады; магчымыя ўзрушэнні ў эканоміцы Кітая пасля прыходу пятага пакалення камуністычных лідараў у 2012-13 гадах; прэзідэнцкія выбары ў Злучаных Штатах; пачатак распаду еўразоны, калі не будзе ажыццяўлення нейкіх нестандартных высілкаў па выратаванні еўра.

Курс еўра адносна долара працягвае падаць. На мінулым тыдні яго значэнне апусцілася да 1,2831 долара, што з'яўляецца 16-месячным мінімумам. Трэйдары не паверылі ў еўрапейскую валюту нават пасля прыцягнення Францыяй амаль 8 млрд еўра па аблігацыях. Прэм'ер-міністр Грэцыі Лукас Пападэмас увогуле лічыць, што ўжо ў сакавіку яго краіну можа чакаць абвальны крызіс. А не вытрывае хоць адна краіна еўразоны — нічога добрага і астатнім чакаць не прыйдзецца. ЗША, у сваю чаргу, плануюць новае павышэнне ліміту дзяржаўнага доўгу на 1,2 трлн да 16,394 трлн долараў, каб у выпадку чаго ўрад краіны мог пазычыць пабольш грошай. Пры цяперашнім ліміце — гэта толькі 100 мільярдаў долараў.

Беларусь жа ў Стары Новы год уваходзіць з наступнымі курсамі асноўных валют: 8400 беларускіх рублёў за долар (мінус 0,5 %), 10810 — за еўра (плюс 0,09 %) і 266 — за расійскі рубель (плюс 2 %), які, між іншым, на гэтым тыдні «вярнуўся з адпачынку» і з новымі сіламі ўмацаваўся да беларускага брата.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

Інвестыцыі

### ТАМ, ДЗЕ ВЫГАДНА

**45 прадпрыемстваў сталі летась рэзідэнтамі свабоднай эканамічнай зоны «Гроднаінвест».**

Яны ажыццяўляюць праекты ў машынабудаванні, металаапрацоўцы, дрэваапрацоўцы, хімічнай і харчовай прамысловасці, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў і ў іншых галінах. Агульны аб'ём інвестыцый у асноўны капітал складзе 460 мільёнаў еўра, ствараецца 5225 рабочых месцаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**




## Азаранка: ёсць першы трафей у сезоне!

**Трэцяя ракетка свету беларуска Вікторыя Азаранка стала пераможцам турніру ў Сіднэі з прызавым фондам 637 тысяч долараў.**

Учора ў фінале наша прыма абыграла леташняга пераможцу турніру, кітаянку На Лі — 6:2, 1:6, 6:3. Матч працягваўся 1 гадзіну 56 хвілін. Зараз агульны баланс сустрэч Азаранкі з кітаянкай амаль зраўняўся — 3:4.

А ў панядзелак у Мельбурне стартуе адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (прызавы фонд $11 млн 806 тыс.). У асноўнай сетцы жаночага адзінкавага разраду выступяць тры беларускія тэнісісткі. Азаранка стартавы матч правядзе з прадстаўніцай Вялікабрытаніі Хітар Уотсан, Настасся Якімава пазмагаецца з італьянкай Рамінай Апрандзі, а Вольга Гаварцова — з аўстрыйкай Патрысіяй Майр-Ахляйтнер. У мужчынскім адзінкавым разрадзе праз кваліфікацыю Australian Open спрабаваў прабіцца Уладзімір Ігнацік, аднак саступіў эстонцу Юргену Зопу — 6:2, 5:7, 7:9.

Птушкі Беларусі

### ПАДЛІЧЫЦЬ І ПАКАРМІЦЬ

**У суботу і нядзелю грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны (АПБ)» распачынае лічыць нашых крылатых сяброў, якія засталіся на зімоўку на тэрыторыі Беларусі.**

Як адзначыў рэдакцыі **спецыяліст па экалагічнай адукацыі АПБ Руслан ШАЙКІН,** менавіта зімой многія птушкі ляцяць бліжэй да чалавечага жылля. Таму лягчэй за ўсё птушак зімой можна назіраць на папярэдне ўсталяваных кармушках, якія размешчаны побач з домам. Самымі звычайнымі гасцямі на кармушках з'яўляюцца вялікая сініца, дамавы і палявы вераб'і. Падсілкавацца туды прылятаюць зеленушкі, блакітніцы, папаўзні, дубаносы, а часам снегіры і сойкі. Бываюць выпадкі, калі на кармушку прылятае і «чырванакніжная» зялёная ці сівая жаўна.

Прыняць удзел у акцыі «Птушкі на кармушцы» можа любы жыхар Беларусі. Сярод удзельнікаў акцыі потым будзе разыграны палявы бінокль.

Для ўдзелу ў гэтай акцыі неабходна ў адзін з гэтых выхадных палічыць віды і колькасць птушак, што прылятаюць на кармушку, і разам з інфармацыяй пра сябе (імя, прозвішча, месца назірання, кантактны тэлефон) паведаміць вынікі назіранняў у АПБ.

Адрас каардынатара акцыі: 222397, Мінская вобласць, г. Мядзел, вул. Ленінская, 2, з паметкай «Птушкі на кармушцы-2012».

Электронны адрас: info@ptushki.org; тэлефон АПБ: 8 (017) 263 06 13.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### Ім дым Айчыны...

...Полацкія памежнікі сумесна з супрацоўнікамі міліцыі ў пункце пропуску «Бігосава-1» ноччу пры афармленні на выезд грузавога цягніка Полацк—Даўгаўпілс у паўвагоне з вугалем знайшлі 50 каробак цыгарэт, унутры якіх было 25 тысяч пачкаў. Каб дастаць іх, людзям у форме спатрэбілася больш за дзве гадзіны. Гаспадар нелегальнага грузу агульным коштам 66 мільёнаў рублёў пажадаў застацца невядомым.

...Супрацоўнікамі міліцыі Брэста складзены адміністратыўны пратакол на машыніста польскай чыгункі, 59-гадовага грамадзяніна РП, у лакаматыве якога было схавана 1090 пачкаў цыгарэт беларускай вытворчасці. Кантрабанда пацягнула на 5 400 000 рублёў. Зразумела: чалавек хацеў зарабіць на цыгарэтах. А ўсё таму, што курава ў нас значна таннейшае, чым за Бугам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, Яна СВЕТАВА.**

Парламенцкая кухня

## РЭЦЭПТ РАЎНАВАГІ

***Дэпутат Алена Шамаль лічыць за лепшае дзейнічаць мякка, але непапулярных рашэнняў не баіцца***

Ала МАЧАЛАВА

**СТУК абцасаў па маставой. Зграбная брунетка садзіцца ў сваю машыну, прыпаркаваную на вуліцы Берсана. Яна спрытна манеўруе і за рулём пачувае сябе ўпэўнена. Ведае, аднак, што да жанчыны на дарозе стаўленне асаблівае — і прапусцяць, і дапамогуць, калі што. Феміністкай яе не назавеш. Яна гутарыць мякка і спакойна, але за пяшчотнымі інтанацыямі адчуваецца цвёрдая пазіцыя. Ад яе зыходзіць пазітыў, нават калі размова ідзе пра самыя негатыўныя рэчы. Яе цяжка ўявіць раздражнёнай ці раззлаванай — настолькі яна ўраўнаважаная. Яна прагматычны палітык і клапатлівая жонка ды маці. Сама гармонія?! Пра тое, як утрымліваць раўнавагу ў асабістым жыцці і кар'еры, як захаваць баланс правоў адных і свабод іншых, распрацоўваючы закон, гутарым з дэпутатам парламента Аленай Шамаль у яе на кухні.**

«Фартухоў я не люблю», — адразу папярэджвае суразмоўніца, і па яе спрытных выверaных рухах становіцца зразумела, што ў фартуху няма і патрэбы. «Гатую тое, што не патрабуе шмат часу», — прызнаецца гаспадыня, і я не паспяваю заўважыць, як у яе руках з'яўляюцца кухонныя прылады і ўсё, здаецца, само рэжацца і дзярэцца.

Каронная страва спадарыні Шамаль — лянівыя галубцы. Іх любіць уся сям'я. «У аднаго са сваякоў ёсць нюх на маміны галубцы», — «здае» дачка Маруся. — «Ён неспадзявана прыходзіць у госці менавіта тады, калі мама іх гатуе, і можа з'есці, здаецца, усю каструлю!». Адчуваю, гатаваць трэба яшчэ хутчэй, а то не хопіць смакаты!

Да сустрэчы з Аленай Шамаль лянівыя галубцы ў маім уяўленні былі толькі ў выглядзе кашы. «Неэстэтычна», — расчароўваецца суразмоўніца. Яна лоўка лепіць з фаршу, рысу, нашынкаванай капусты, цыбулі і надзертай морквы кругляшы. Клопату асаблівага гэта не дадае, а выглядае, насамрэч, куды больш прывабна.

СТАР. 2




Гатаваць з Аленай Шамаль — адно задавальненне.



### ЛЯНІВЫЯ ГАЛУБЦЫ

Нам спатрэбіцца паўкіло фаршу (наша гаспадыня аддае перавагу змешанаму — свініна з ялавічынай), паўшклянкі рысу, морква, цыбуля, дробна нашаткаваная капуста, яйка, соль, прыправы. Змешваем, лепім буйныя шарыкі. Паверх сыплем зноў жа капусту, нарэзаныя кубікамі салодкі перац ды памідоры, надзёртую моркву, дадаём таматную пасту. Тушым. Захоўваем цярпенне да таго моманту, калі яны будуць гатовы і атрымаецца імі паласавацца!

### ЗАВЫСІЛІ КОШТ АБ'ЕКТА

**Прадпрыемства «Баранавіцкая гарадская ЖКГ» у жніўні 2010 года заключыла дзяржаўны кантракт з падрадчыкам ТАА з Мінска на выкананне добраўпарадкавання вул. Доўгай у Баранавічах.**

У выніку праверкі АБЭЗ Баранавіцкага ГАУС і Баранавіцкім міжраённым Камітэтам дзяржаўнага кантролю ўстаноўлена завышэнне кошту будаўнічых работ, што магло прывесці да павялічэння кошту аб'екта на 941 848 600 рублёў. Вядзецца працэдура па ануляванні кантракта з мінскім прадпрыемствам.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**




ISSN 1990 - 763X

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.01.2012 г. (для б/н разлікаў) | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША ... 8 400,00 | 1 чэшская крона ... 423,33 |
| ▲ 1 еўра ... 10 810,00 | 1 польскі злоты ... 2 450,94 |
| 1 латвійскі лат ... 15 441,18 | ▼ 1 расійскі рубель ... 266,00 |
| 1 літоўскі літ ... 3 130,01 | 1 украінская грыўня ... 1 044,78 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 31,5830 |
| 10 UAH | 39,2823 |
| 10000 BYR | 37,3322 |
| EUR | 40,6189 |

## Яблыневыя дровы — адны з лепшых з пладовых дрэў. Толькі, вядома, сустракаюцца рэдка

**«ГАРАЧЫ» 287 17 41**

**Мікалай Мікалаевіч Іваноў з вёскі Зелянец Карэліцкага раёна — даўні прыхільнік «Звязды». Выданне чытае, па яго ўласным прызнанні, больш за 20 гадоў. І менавіта ў нашай газеце заяўніку колькі гадоў таму на вочы трапілася інфармацыя пра тое, колькі цяпла дае пры спальванні драўніна розных парод.**

— За «пункт адліку» быў узяты дуб. Дык вось, каб атрымаць столькі ж цяпла, як пры спальванні ў печы аднаго кубаметра дубу, трэба было ўзяць 1,8 кубаметра елкі, 1,6 кубаметра сасны, 1,2 кубаметра бярозы ці вольхі, 2 кубаметры асіны, — расказаў чытач. — А як з пладовымі дрэвамі? У мяне стары сад, які збіраюся абнаўляць, вядома, спілаваныя яблыні, грушы, вішні пойдуць на дровы. А колькі ж ад іх можна атрымаць цяпла? А яшчэ ад граба?

У заяўніка дом агульнай плошчай 49 квадратных метраў (колішні калгасны, прыватызаваны). Па словах Мікалая Мікалаевіча, дастаткова халодны. Ацяпляецца жыллё грубкай.

Каб даць кампетэнтны адказ на запыт Мікалая Мікалаевіча, мы мусілі звярнуцца па дапамогу ў Міністэрства лясной гаспадаркі.

Нам вельмі дапамагла галоўны спецыяліст аддзела прамысловай вытворчасці Галіна Рахімбердзіна, якая аператыўна падрыхтавала грунтоўны адказ.

— Дровы з розных парод драўніны аддаюць пры спальванні розную колькасць цяпла. Драўніна цвёрдалісцевых парод валодае найбольш высокай цеплааддачай. Да такіх парод адносяцца дуб, бук, граб, ясень, клён. З іх найбольшую цеплатворную здольнасць мае драўніна граба. Яна вышэйшая, чым у дуба. Удзельная цеплатворная здольнасць пры вільготнасці 20 % у дуба — 1 538 ккал, у граба — 1 654 ккал. З паніжэннем вільготнасці павялічваецца цеплатворная здольнасць, а з павялічэннем — зніжаецца, — распавяла Галіна Мікалаеўна. — Дровы з цвёрдалісцевых парод забяспечваюць стабільную рабочую тэмпературу ў топцы і высокую ўдзельную цеплатворную здольнасць.

Як нагадала далей суразмоўца, дубовыя дровы і дровы з граба цяжка калоць, распальваць, але затое яны даюць драўняны вугаль, які доўга тлее. Драўніна пладовых дрэў (яблынь, груш і іншых) валодае цеплатворнай здольнасцю, блізкай да драўніны цвёрдалістых парод. Дровы з яблыні і грушы лёгка калоць, яны добра гараць, даюць шмат стойкага жару, прыемна пахнуць. Лепшымі дровамі з пладовых дрэў лічацца яблыневыя, якія вядомыя сваім асаблівым гарачым і бяздымным гарэннем. Рэдка сустракаюцца, паколькі сякуць звычайна толькі паваленыя або прызначаныя да высечкі пры расчыстцы тэрыторый дрэвы.

Вішня адносіцца да парод сярэдняй цвёрдасці драўніны. Вішнёвыя дровы лёгка калоць, але цяжка распальваць, пры гарэнні яны крыху дымяць. Дровы з мяккалісцевых парод (бяроза, вольха, ліпа, асіна, таполя і іншыя) з-за невысокай іх шчыльнасці хутка згараюць, не ўтвараючы вуглёў, валодаюць нізкай удзельнай цеплатворнай здольнасцю.

— Ваш чытач прыводзіць прыклад, што для атрымання пэўнай колькасці цяпла патрабуецца 1 кубічны метр дуба, а для атрымання такой жа колькасці цяпла ад елкі патрабуецца 1,8 кубаметра, 1,6 кубаметра — ад сасны, 1,2 кубаметра — ад бярозы ці вольхі, 2 кубаметры — ад асіны. Бяроза і вольха аднесены да адной групы па цеплатворнай здольнасці. Гэта няправільна. Пры аднолькавай вільготнасці драўніны ў 20 % аб'ёмная вага ў кілаграмах бярозы — 670, вольхі — 540; умоўнае паліва ў кілаграмах у бярозы — 324, вольхі — 261 (іншымі словамі, у адным і тым жа аб'ёме можа быць розная вага, напрыклад, літровы слоік вады і мёду будуць важыць па-рознаму). Акрамя таго, завышаны паказчыкі па іншых відах драўніны, — расказала далей галоўны спецыяліст аддзела прамысловай вытворчасці Міністэрства лясной гаспадаркі Галіна Рахімбердзіна. — Адказваючы на пытанне чытача, паведамляю, што для атрымання пэўнай колькасці цяпла патрабуецца 1 кубічны метр дуба, а для атрымання такой жа колькасці цяпла ад граба — прыкладна 0,89 кубічнага метра, ад яблыні — 1,04 кубічнага метра, ад грушы — 1,06 кубічнага метра, ад вішні — 1,07 кубічнага метра, ад бярозы — 1,1 кубічнага метра, ад вольхі — 1,34 кубічнага метра, ад сасны — 1,35 кубічнага метра, ад асіны — 1,44 кубічнага метра, ад елкі — 1,5 кубічнага метра.

Далей спецыяліст нагадала, што цеплааддача дроў, акрамя шчыльнасці драўніны, залежыць ад вільготнасці. Найлепшымі пры спальванні лічацца дровы з вільготнасцю 20-25 %. Дровы са свежазсечаных дрэў маюць вільготнасць не меней за 50 %. Каб высушыць дровы, іх трэба цягам года трымаць на адкрытым паветры ці ў памяшканні, якое добра праветрываецца. Іх трэба складваць у кладку дроў. Калі яна знаходзіцца не пад навесам, яе трэба прыкрыць, напрыклад, рубероідам ці поліэтыленам. Пры гэтым бакавыя паверхні павінны быць адкрытымі для прасушкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МЗС РФ ПАРАЎНАЎ САНКЦЫІ СУПРАЦЬ ІРАНА СА СПРОБАЙ ЗМЕНЫ РЭЖЫМУ

**Дадатковыя санкцыі супраць Ірана, як і магчымы ваенны ўдар па ІРІ, без сумневу, будуць успрымацца ў міжнароднай супольнасці як спроба змены рэжыму ў Тэгеране, — заявіў намеснік кіраўніка МЗС Генадзь Гацілаў.**

Паводле меркавання расійскага знешнепалітычнага ведамства, «санкцыйныя меры ўздзеяння на Іран па лініі СБ ААН цалкам сябе вычарпалі», і ўсё, што выходзіць за іх рамкі, «не мае дачынення да задачы ўмацавання рэжыму ядзернага нераспаўсюджвання».

У прыватнасці, прыняцце заходнімі дзяржавамі аднабаковых санкцый, адзначыў Гацілаў, «аказвае негатыўнае ўздзеянне на насельніцтва Ірана і яго эканоміку» і падрывае высілкі па ўрэгуляванні іранскай ядзернай праграмы.

Раней, 1 студзеня 2012 года, ЗША ўвялі санкцыі супраць Цэнтрабанка Ірана. Пра сваю гатоўнасць далучыцца да мер, уведзеных Вашынгтонам, заявілі краіны Еўрасаюза і Японія. Турцыя, якая таксама імпартуе нафту з Ірана, абвясціла, што яна да амерыканскіх санкцый не далучыцца.

### НАВУКОЎЦЫ ПАПЯРЭДЗІЛІ ПРА НЕБЯСПЕКУ САСІСАК



**Шведскія даследчыкі заявілі, што харчаванне мясам, якое падверглася тэхналагічнай апрацоўцы (на прыклад, сасіскамі ці беконам), можа прывесці да раку падстраўнікавай залозы.**

У новым даследаванні, апублікаваным у British Journal of Cancer, гаворыцца пра тое, што ўжыванне адной сасіскі ці дзвюх лустачак бекону ў дзень можа павялічыць рызыку развіцця ў чалавека раку падстраўнікавай залозы на 19%, у параўнанні з людзьмі, якія зусім не ядуць апрацаванага мяса. Раней навукоўцы ўстанавілі ўзаемасувязь паміж ужываннем такога мяса і ракам кішэчніка. Аднак адмыслоўцы, якія абследавалі больш за 6 тысяч чалавек, папярэджваюць, што шанцы на дыягностыку ў чалавека раку падстраўнікавай залозы застаюцца параўнальна невялікімі. Сусветны фонд даследаванняў раку адзначае, што значна больш трывалая ўзаемасувязь існуе паміж узнікненнем гэтага захворвання і курэннем ці атлусценнем.

### ІТАЛЬЯНСКІ ВУЧОНЫ: УЖО НАРАДЗІЛАСЯ ДЗІЦЯ, ЯКОЕ БУДЗЕ ШПАЦЫРАВАЦЬ ПА МАРСЕ

**Італьянская газета La Repubblica вырашыла прадказаць адкрыцці, якія зменяць жыццё чалавецтва ў найбліжэйшыя паўстагоддзя.**



«Праз 50 гадоў мы будзем жыць лепш. Мы будзем ездзіць на аўтамабілях, якія працуюць на сонечнай энергіі, і есці мяса, выпрабленае ў лабараторыі, без забойства жывёл. Мы будзем браць энергію, якая нам патрэбна, з цэнтра Зямлі і развітаемся, нарэшце, з газам і нафтай», — піша выданне.

Джавані Біньямі, навуковец сусветнай велічыні, які з нядаўняга часу ўзначальвае Нацыянальны інстытут астрафізікі, здзейсніў вандроўку па свеце, каб зразумець, якія адкрыцці, здольныя змяніць наша жыццё, яшчэ застаецца зрабіць. Якім будзе наша жыццё ў 2062 годзе? Біньямі ўпэўнены: «Ужо нарадзілася дзіця, якое будзе шпацыраваць па Марсе». Таму што планы заваявання Марса распрацаваны ўжо даўно. Навуковец сцвярджае, што на Марс варта ляцець, каб «зразумець сакрэт жыцця, таямніцу таго, як яно сфарміравалася ў Сусвеце».

Затым будзе адкрыта новае, недасягальнае жыццё. Спатрэбіцца шанцаванне, каб перахапіць сігнал з глыбокага космасу. Але гэта рэальна. І гэта надасць нам упэўненасці ў тым, што ў іншай сонечнай сістэме існуе разумнае жыццё. «З гэтага моманту ў кожным з нас штосьці зменіцца», — перакананы навуковец.

Да 2062 года вялікую частку працы замест чалавека будуць выконваць малекулярныя канструктары, малюе будучыню суразмоўца выдання, а працягласць жыцця чалавека значна павялічыцца. «У 2062 годзе народзіцца дзіця, якое будзе жыць 152 гады», — упэўнены італьянскі навуковец.

# Рэцэпт раўнавагі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Не ўтрымліваюся ад традыцыйнага жаночага пытання: як пры такіх кулінарных талентах атрымліваецца захоўваць фігуру?

— Аніякіх дыет не прытрымліваюся. Мне пашанцавала: я не люблю здобы, — тлумачыць жанчына, і яе твар праменіцца ўсмешкай. — А вось з роднымі рэгулярна праводжу тэматычныя гутаркі! Яны ў мяне любяць нездаровую ежу, усё тое, што таўсціць.

Яшчэ лепш, бадай, чым тэматычныя гутаркі, справе дапамагаюць сумесныя заняткі спортам. У цёплае надвор'е, напрыклад, сямейства выязджае на велапрагулкі. Веласіпед ёсць і ў мамы, і ў таты, і ў дачкі (з Бабруйска ў Мінск пераехалі ўсёй сям'ёй пасля абрання Алены Шамаль дэпутатам). Узімку — з задавальненнем коўзаюцца на каньках. Ці не больш, чым займацца спортам, сям'я любіць назіраць за тым, як гэта робяць прафесіяналы. Футбол, тэніс, хакей — яны ў курсе ўсіх перамог і паражэнняў. І кошка Муся заўжды непадалёк. Гаспадарам яна абавязана сваім жыццём. Яны не змаглі прайсці міма кінутага кацяняці. Кволенькае малое яшчэ трэба было выхадзіць. «Я сама ёй рабіла ўколы», — згадвае суразмоўніца. Да дэпутацтва яна займалася медыцынай.

Цікавімся, як доктару ў парламенце. «Каласальная розніца ў хуткасці прыняцця рашэнняў, — аналізуе суразмоўніца. — Над законапраектам мы практычна год працуем: і тое абмяркуеш, і тое ўзважыш. А ў медыцыне рашэнні прымаюцца экстрэмальна. Тым больш на пасадзе намесніка галоўнага ўрача па медыцынскай частцы: усе крытычныя выпадкі, рэанімацыі былі ў маёй кампетэнцыі». Ёсць і тэхнічныя нюансы: «З самага пачатку было вельмі цяжка разабрацца ва ўсіх тонкасцях юрыспрудэнцыі. Хоць я не заўжды згодна з юрыстамі, якія працуюць з намі над законапраектамі, — шмат бывае спрэчак наконт падачы інфармацыі. Мне заўжды хочацца, каб тэкст дакумента быў лёгкім, зразумелым і даступным, але правілы юрыдычнай тэхнікі часам абмяжоўваюць нас у выкладанні. Здараецца, атрымліваецца празмерна суха і груваста, але нічога не папішаш».

«Дэпутат павінен, атрымліваючы інфармацыю ад грамадства, падрыхтаваць закон так, каб ён працаваў, — так уяўляе сваю місію парламентарый. — Самае прыемнае, калі кажуць, што гэты закон патрэбны».

Пра акругу яна распавядае з гонарам, з тонкім адчуваннем менталітэту бабруйчан. Многім ласунам Бабруйск вядомы па зефіры. «Наша ядомая візітоўка», — задаволена заўважае народная выбранніца. «У нас вельмі моцная культура, — дадае бабруйчанка. — Горад славіцца сваімі танцавальнымі пастаноўкамі». Улічваючы спецыялізацыю народнай выбранніцы, няцяжка здагадацца, што ў акрузе яна арыентуецца найперш на сацыяльную сферу.

— Будаўніцтва радзільнага дома ўжо ідзе. Патрэбна яшчэ рэканструкцыя дзіцячай бальніцы, туберкулёзнай клінікі, — пералічвае дэпутат. — У раёнах новабудоўляў адчуваецца недахоп садкоў. На іншых тэрыторыях — праблема школ: адны патрабуюць рамонту,



**Алена Шамаль (другая злева) з калегамі — удзельнікі велазаезду падчас рэспубліканскага фізкультурна-спартыўнага свята з нагоды Дня Незалежнасці.**

іншыя — перапланіроўкі. Работа ідзе, проста больш марудна з-за складанай эканамічнай сітуацыі.

Калі цяжкасці толькі пачыналіся, згадвае парламентарый, усё было на эмоцыях. Але паціху прыходзіць усведамленне: «Зарабіў — атрымай, атрымаў — патраць столькі, колькі ёсць у тваім кашальку».

Як адбіліся праблемы айчыннай эканомікі на самой народнай выбранніцы?

— Банкаўскіх укладаў у мяне не было, таму канкрэтных страчаных сум у выніку дэвальвацыі назваць не магу. Пакупная здольнасць майго заробку знізілася, як ва ўсіх, таму да выдаткаў стала падыходзіць больш асэнсавана.

Парламентарый прызнае, што ў няпростай эканамічнай сітуацыі ўлады вымушаны прымаць непапулярныя рашэнні. «Але ўсе гэтыя рэформы рабіліся выключна дзеля таго, каб былі ў скарбонцы сродкі на пенсіі, дапамогі, выплаты па пазыках — на самае крытычнае, прычым не на адзін месяц».

Абмежавальныя і забарончыя захады прымаліся ў законапраектах і самімі парламентарыямі. Ці не шмат засланак у гэты і без таго няпросты час?

— Правы аднаго чалавека заканчваюцца там, дзе пачынаюцца правы іншага. Павінен быць баланс паміж усімі, — упэўнена дэпутат.

Вось і курыруемы ёю праект закона аб папярэджанні распаўсюджвання сацыяльна небяспечных захворванняў і ВІЧ варта, на яе думку, разглядаць не толькі як прымус хворым абследавацца і лячыцца, але і як захад па абароне здаровых. Праект закона падзяляе сацыяльна небяспечныя захворванні і ВІЧ. У выпадку першых (да прыкладу, сухоты органаў дыхання з бактэрыявыдзяленнем, некаторыя венерычныя захворванні — такія, як сіфіліс і ганарэя, і іншае) прадугледжваецца прымусовае лячэнне.

У выпадку падазрэння на ВІЧ законапраектам прапісваецца прымусовае абследаванне.

— Гэта не дыскрымінацыя чалавека, — падкрэслівае Алена Шамаль. — Задача — прапанаваць хвораму ранняе лячэнне (у свеце неблагія вынікі па стабілізацыі цячэння ВІЧ-інфекцыі) і абараніць яго атачэнне. На жаль, колькасць ВІЧ-інфіцыраваных у Беларусі не змяншаецца, яна кумулюецца з года ў год. Паводле апошніх звестак, іх больш за 12 тысяч. І наркотыкі ў распаўсюджванні гэтай хваробы адыходзяць на другі план: заражэнне адбываецца найчасцей палавым шляхам. Трэба з павагай падыходзіць і да чалавека, які хварэе, і да чалавека, які побач з ім і пакуль здаровы. Каб замкнуць кола, варта як мага больш дакладна высветліць крыніцу і ўсе звёны ланцуга. За наўмыснае распаўсюджванне ВІЧ-інфекцыі, дарэчы, ёсць крымінальная адказнасць.

Хворых на сухоты ў Беларусі прыкладна столькі ж, колькі і ВІЧ-інфіцыраваных, — каля 12 тыс. «На жаль, гэта хвароба не толькі лёгкіх, але і вачэй, мачавога пузыра, спіннога мозга — лакалізацыя розная», — тлумачыць спадарыня Шамаль. Знамянальна, што больш за ўсё захварэлых — у яе рэгіёне, на Магілёўшчыне.

— Сухоты дрэнна паддаюцца лячэнню, калі развіваецца лекавая ўстойлівасць. Хварэюць дзеці, на жаль, ад сухотаў паміраюць, становяцца інвалідамі.

Самае сумнае, што заразіцца можна паветрана-кропельным шляхам: едучы з хворым у аўтобусе або сустракаючыся на адной лесвічнай клетцы. Таму заканадаўцы прадугледзелі магчымасць лячыць хворых на сухоты і іншыя сацыяльна небяспечныя хваробы прымусова. Тым больш што, будзем шчырымі, захварэлыя — пераважна людзі асацыяльныя. Мы далёкія ад думкі, што яны паспяшаюцца лячыцца добраахвотна.

Іх права, здавалася б, аднак ад іх могуць заразіцца астатнія. Гэта якраз той выпадак, калі свабода аднаго чалавека заканчваецца там, дзе пачынаецца свабода іншага. Сваёй адмовай ад лячэння яны ўздзейнічаюць на астатніх. Значыць, у тых павінна быць права на прымус. Дасягнуць балансу няпроста, але дзеля гэтага і працуюць заканатворцы.

### ТВАРОЖНАЕ ПЕЧЫВА



Простае, смачнае ды з іскрынкай, як сама гаспадыня!

Растопліваем сметанковае масла (паўпачкі), дадаём тварог (250 г), мукі, пагашанай соды. Ні цукру, ні солі не трэба. Атрыманую масу скатваем у шарыкі, злёгку абвальваючы ў муцэ, каб крыху прыхапіліся і не расплываліся на талерцы. Ставім у халадзільнік. Пасля раскатваем кожны кругляш скалкай як мага больш тонка, у сярэдзінку кладзём дробку цукру, заварочваем канверцікам — і ў духоўку. Чакаем, пакуль падымуцца і стануць такімі пухленькімі. Цяпер можна частавацца!

### ВІНШАВАННЕ ПРЭЗІДЭНТА

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Старшыню Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь Анатоля Афанасьева з 70-гадовым юбілеем.**

«Упэўнены, што Ваш навуковы аўтарытэт і талент кіраўніка будуць і ў далейшым садзейнічаць паспяховай дзейнасці Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, назапашванню і эфектыўнай рэалізацыі навуковага патэнцыялу Беларусі», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка таксама пажадаў Анатолю Афанасьеву моцнага здароўя, ажыццяўлення намечаных планаў, шчасця і дабрабыту.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

### Абзац

◢ **Беларускімі і польскімі навукоўцамі ў Белавежскай пушчы праводзяцца сумесныя даследаванні міграцый рысі і ўплыў гэтага драпежніка на папуляцыі дзікіх капытных жывёл. Падлічана, што ў пушчы жыве каля 20 рысяў. Пры гэтым пастаяннай тэрыторыяй іх пасялення з'яўляюцца як польская, так і беларуская часткі пушчы.**

◢ У Мінску 14-15 студзеня каля Палаца спорту пройдзе завяршальны Каляднy кірмаш. Перапрацоўчыя арганізацыі, прадпрыемствы-вытворцы і фермерскія гаспадаркі Магілёўскай вобласці прывязуць сюды сваю прадукцыю: мяса і мясныя паўфабрыкаты, каўбасныя вырабы і вэнджаніну, малочную прадукцыю, хлебабулачныя і кандытарскія вырабы, сажалкавую і азёрна-рачную рыбу, а таксама сувеніры, падарункі і многае іншае па цэнах вытворцаў.

◢ **Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, спажывецкія цэны на тавары і платныя паслугі насельніцтву з пачатку года (па стане на 10 студзеня) выраслі ў параўнанні з сярэднімі цэнамі снежня на 0,5%. Найбольшы рост цэн адзначаны на піва — на 2,5%, ялавічыну (акрамя бескасцявога мяса) — 2,1%, гарэлку — 1,8%, крупы манныя — 1,2%. З паслуг больш за ўсё падаражэлі санаторна-аздараўленчыя — на 20,4% і культуры — на 15,6%. Цэны знізіліся на рыбу марожаную і малако (на 0,2%), смятану (на 0,9%), тварог тлусты (на 0,4%), крупы прасяныя (на 1%), крупы грэцкія (на 1,3%), капусту свежую белакачанную (на 0,5%), моркву (на 2,2%).**

### Поўны абзац

◢ Жыхарка Томска (Расія) нарадзіла дзіця вагой 6,4 кг, што ў медыцынскай практыцы з'яўляецца вялікай рэдкасцю. Урачы Томскага абласнога перынатальнага цэнтра паспяхова правялі аперацыю па родадапамозе. Звычайна вага здаровых дзяцей, якія нарадзіліся ў тэрмін, складае ад 3 да 3,5 кг. Згодна са статыстыкай, нараджэнне такіх дзяцей-волатаў — рэдкасць: адно малое на некалькі тысяч. У бальніцы паведамілі, што ў іх наогул такіх дзяцей пакуль не было. Мама і дзіця пачуваюцца нармальна.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

### «ДЫНАМА» ЗНОЎ САСТУПІЛА «МЕТАЛУРГУ»

Хакеісты мінскага «Дынама» ў чэмпіянаце КХЛ прайгралі на сваёй пляцоўцы магнітагорскаму «Металургу». У гаспадароў дублем адзначыўся Збынек Іргл, яшчэ шайбу закінуў Андрэй Стась. У першым матчы сапернікаў у цяперашнім сезоне 9 снежня ў Магнітагорску мінчане таксама прайгралі «Металургу» — 2:3. Гэта трэцяе паражэнне дынамаўцаў у чатырох апошніх матчах, і яно адкінула мінскі клуб на 5-е месца ў Заходняй канферэнцыі.

15 февраля 2012 г. в 12.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Брестская передвижная механизированная колонна № 1».

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2011 год и основные направления деятельности общества в 2012 г.
2. Отчет совета директоров общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках общества за 2011 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2011 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2012 году и первом квартале 2013 г.
6. О материальном вознаграждении членов совета директоров и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов совета директоров и ревизионной комиссии.

Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Белорусская, 51.

Начало регистрации в 11.30. *УНП 200215539*

### Калі няма замка

Выпадак, які здарыўся ў в. Юшкавічы (Баранавіцкі раён), можна лічыць рэкордным. Там зладзеі залезлі ў прыватны куратнік і выкралі 47 курэй і 5 гусак. На дзвярах куратніка не было замка. Гаспадар падлічыў, што ўкрадзеная птушка пацягнула амаль на 5 млн рублёў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# УВАХОДЖАННЕ Ў БАЛОНСКІ ПРАЦЭС — НЕ ПРОСТА ДАНІНА МОДЗЕ

**Тэрміны падрыхтоўкі спецыялістаў у беларускіх ВНУ могуць быць скарочаны. Пра гэта падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА паведаміў рэктар Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Міхаіл ДЗЯМЧУК.**

Паводле слоў Міхаіла Дземчука, сёння разглядаюцца розныя варыянты скарачэння тэрмінаў падрыхтоўкі па асобных спецыяльнасцях вышэйшай адукацыі. «Адназначна можна сказаць, што гэта не будзе фармальным скарачэннем», — пабяцаў Міхаіл Дзямчук. Скарачэнне будзе дасягацца шляхам змястоўнай аптымізацыі сацыяльна-гуманітарнага кампанента ў падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і больш рацыянальнага складання вучэбных планаў і праграм. Да таго ж пад улік будуць брацца і прапановы саміх вышэйшых навучальных устаноў.

Галоўнай тэмай анлайн-канферэнцыі было далучэнне нашай краіны да Балонскага працэсу. Трэба нагадаць, што Беларусь ужо падала пакет дакументаў у Балонскі сакратарыят і прапануе разгледзець пытанне аб уключэнні нашай краіны ў кола дзяржаў-удзельніц Балонскага працэсу на канферэнцыі міністраў адукацыі ў красавіку бягучага года.

Міхаіл Дзямчук запэўніў, што рашэнне аб уваходжанні ў Балонскі працэс прадыктавана не данінай модзе, а перш за ўсё неабходнасцю састыкоўкі сістэмы адукацыі Беларусі з сістэмамі адукацыі іншых краін ва ўмовах глабалізацыі эканомікі і неабходнасцю аптымізацыі ўсёй адукацыйнай сеткі. Ён падкрэсліў, што рэформы карысныя, толькі калі яны вядуць да павышэння якасці адукацыі, а калі ў выніку іх увасаблення якасць адукацыі пагаршаецца, то такія пераўтварэнні проста шкодныя. Напрыклад, у шэрагу краін адзначаецца зніжэнне якасці адукацыі на першай ступені вышэйшай школы ва ўмовах скарочаных тэрмінаў навучання. У Беларусі масавы пераход на дыферэнцыяваныя тэрміны падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй адбыўся яшчэ ў 2008 годзе. Аднак рэалізаваны ён быў адначасова з аптымізацыяй вучэбна-праграмнай дакументацыі, якая рэгламентуе адукацыйны працэс, і ўвядзеннем адукацыйных стандартаў новага пакалення, якія рэалізуюць кампетэнтнасны падыход у падрыхтоўцы спецыялістаў. «Гэта дазволіла пазбегнуць зніжэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў», — падкрэсліў ён.

Устаноўленыя ў сістэме вышэйшай адукацыі Беларусі тэрміны навучання супастаўныя з еўрапейскімі. «Для паступлення ў еўрапейскі ўніверсітэт патрабуецца 12-13-гадовая агульная сярэдняя адукацыя, а ў Беларусі эквівалент дванаццатага—трынаццатага года навучання ў еўрапейскай школе арганізаваны ў выглядзе цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у ВНУ, — патлумачыў рэктар РІВШ. — Гэты паказчык складае да 20% вучэбнага часу за пяць гадоў навучання ў ВНУ».

Падключэнне Беларусі да Балонскага працэсу забяспечыць прызнанне беларускіх дыпломаў у Еўропе і наадварот. «Але пра стапрацэнтнае прызнанне ніхто размовы не вядзе. Заўсёды ствараюцца нейкія камісіі, спецыялісты якіх яшчэ раз глядзяць на ўзровень падрыхтоўкі і г.д. Тым не менш нейкія агульныя правілы гульні будуць, — запэўніў Міхаіл Дзямчук. — Уся атрыбутыка ўваходжання ў Балонскі працэс (неабходная дакументацыя, узоры дыпломаў) ужо ёсць. Але гэта не значыць, што мы цалкам адмовімся ад сваіх дакументаў. Выпускнік беларускай ВНУ будзе атрымліваць дыплом дзяржаўнага ўзору, а калі яму спатрэбіцца дыплом еўрапейскага ўзору, то ён зможа яго атрымаць. Адрозненні ёсць: сучасны дадатак да дыплома еўрапейскага ўзору больш аб'ёмны, ён уключае інфармацыю аб веданні выпускніком моў, месцы праходжання практыкі і іншыя звесткі».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Минский городской центр недвижимости

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 16 февраля 2012 года открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Минскдрев»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества)** | **Здание многофункциональное (литер И 2/к) общей площадью 2049,3 кв. м, инвентарный номер 500/С-32442 (двухэтажное кирпичное здание, год постройки – 1995)** |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Солтыса, д. 187 |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Минскдрев», ул. Социалистическая, 20, 220102, г. Минск |
| **Сведения об организаторе аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов** | 8 017 387 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 800 000 000 белорусских рублей |
| **Сведения об обременениях** | Аренда |

Торги проводятся в соответствии с порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Минскдрев», утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019, в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества производится в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится **16 февраля 2011 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 16.01.2012 по 14.02.2012 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 (УП «Минский городской центр недвижимости),**
**(017) 243 50 51 (ОАО «Минскдрев»).**

Минский городской центр недвижимости

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 16 февраля 2012 года открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Строймазтрест»

| | | Инв. № кадастровый | Инв. № бух. |
|---|---|---|---|
| **Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества)** | здание деревообрабатывающего цеха общей площадью 1199 кв.м | 600/С-75417 | ПА431 |
| | здание ангара № 1 общей площадью 1090 кв.м | 600/С-75427 | ПА020 |
| | здание ангара № 2 общей площадью 1080 кв.м | 600/С-75403 | ПА021 |
| | здание ангара № 3 общей площадью 1036 кв.м, | 600/С-75411 | ПА022 |
| | здание артезианской скважины общей площадью 15,4 кв.м | 600/С-75408 | П419 |
| | здание противопожарной насосной станции общей площадью 100,9 кв.м | 600/С-75346 | П524 |
| | здание боксов для автотехники общей площадью 246,4 кв.м | 600/С-75343 | П496 |
| | здание контрольно-пропускного пункта общей площадью 198,6 кв.м, (бытовые помещения» здание сборно-разборное, КПП здание сборно-разборное, здание котельной со складом дров) | 600/С-75340 | П023, П015, П027 |
| | воздушная линия э/передачи на ж/б опорах | | П421 |
| | канализационные сети | | П028 |
| | сети водопроводные | | П422 |
| | ведомственная производственная площадка | | П020 |
| | ведомственная производственная площадка | | П021 |
| | ведомственные производственные площадки и дороги | | П022 |
| | ограждение с ж/б воротами | | П030 |
| | ограждение метал. сетчатое артез. скважины | | П025 |
| | ограждение метал. сетчатое вольера | | П024 |
| | ограждение метал. сетчатое КТПН | | П026 |
| | открытая площадка д/хранения кирпича и ж/б | | П418 |
| | противопожарные резервуары | | П525 |
| | эстакада | | П499 |
| **Сведения о земельном участке** | Кадастровый номер 623686600001000133, площадь – 2,5366 га, назначение – земельный участок для строительства и обслуживания производственной базы и подъездной автодороги | | |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Сеницкий с/с, р-н г.п. Мачулищи | | |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Строймазтрест», ул. Трудовая, 1а, комната 24, 220021, г. Минск | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск | | |
| **Начальная цена предмета торгов** | 17 289 000 000 белорусских рублей | | |
| **Сумма задатка** | 800 000 000 белорусских рублей | | |

Торги проводятся в соответствии с порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Строймазтрест», утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019, в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества производится в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится **16 февраля 2012 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 16.01.2012 по 14.02.2012 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 (УП «Минский городской центр недвижимости»),**
**(017) 242 11 34 (ОАО «Строймазтрест»).**

Минский городской центр недвижимости

## Извещение о проведении 31 января 2012 года открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

| Номер предмета торгов | № 1 | № 2 | № 3 |
|---|---|---|---|
| **Наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества** | Административное помещение общей площадью 248 кв.м, инвентарный номер 500/D-7022355, адрес: г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, пом. 2 | Складское помещение общей площадью 326,3 кв.м, инвентарный номер 500/D-7022356, адрес: г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, пом. 3 | Административное помещение общей площадью 471,8 кв.м, инвентарный номер 500/D-7022357, адрес: г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, пом. 4 |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, ком. 10, 220030, г. Минск | | |
| **Балансодержатель** | ОАО «Тепломонтаж» | | |
| **Начальная цена** | 1 066 181 400 белорусских рублей | 552 871 800 белорусских рублей | 2 262 024 900 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 100 000 000 белорусских рублей | 50 000 000 белорусских рублей | 200 000 000 белорусских рублей |

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Заявитель, желающий участвовать в торгах по нескольким предметам торгов, вносит задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая (окончательная) цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **31 января 2012 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 16.01.2012 по 27.01.2012 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

# КАНТАКТ

№ 1 (17)

СПЕЦПРАЕКТ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА» СУМЕСНА З РУП «БЕЛПОШТА» І РУП «БЕЛСАЮЗДРУК»


**ЦІКАВА НАЗІРАЦЬ, ЯК ЗМЯНІЛІСЯ ФОРМЫ НАШАЙ ПРАЦЫ, ЦЯПЕР МЫ ВЫКАРЫСТОЎВАЕМ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ, ІНТЭРНЭТ, А НЕ ПІШАМ РУКОЙ У СШЫТАЧКУ, ЯК БЫЛО 40, НАВАТ 20 ГАДОЎ ТАМУ**

**ПРЫ ПЛАНАВАННІ І ПРАВЯДЗЕННІ ЎСІХ БУДАЎНІЧЫХ РАБОТ МЫ Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ ДУМАЕМ ПРА ЛЮДЗЕЙ: І ТЫХ, ХТО ПРЫХОДЗІЦЬ ДА НАС, КАБ АТРЫМАЦЬ ПЭЎНЫЯ ПАСЛУГІ, І ТЫХ, ХТО ПРАЦУЕ**

Кампетэнтна

Мікалай НОВІКАЎ, намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» па сацыяльным развіцці і будаўніцтве:

## «Для сваіх людзей мы імкнёмся стварыць камфортныя ўмовы. Прычым не толькі на працы...»

**ЗАМЕСТ ВІЗІТОЎКІ**

**Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белпошта» — адзіны вытворча-тэхналагічны комплекс, у склад якога ўваходзяць 6 абласных філіялаў і філіял «Вузел спецыяльнай сувязі», дзве вытворчасці — «Мінская пошта» і аўтатранспартная, 117 вузлоў паштовай сувязі і больш 3700 аддзяленні паштовай сувязі (з іх амаль тры тысячы ў сельскай мясцовасці)...**



**— Мікалай Георгіевіч, абсалютная большасць чытачоў, падпісчыкаў «Звязды» з'яўляюцца кліентамі пошты, пастаянна бываюць там, а значыць, маюць магчымасць пераканацца, што аддзяленні паштовай сувязі ў нашай краіне прыстойна выглядаюць не толькі знешне... Там заўсёды цёпла і чыста, там кветкі, туды хочацца заходзіць...**

— Што датычыцца ўтульнасці, кветак, то гэта, вядома ж, заслуга гаспадынь — на поштах працуюць у асноўным жанчыны. А вось, што да камфорту... Каля дзвюх тысяч вузлоў і аддзяленняў паштовай сувязі (больш 50 %) за апошнія пяць гадоў перажылі, скажам так, рэканструкцыю, капітальны або бягучы рамонт. Большасць, вядома ж, у рамках выканання дзяржаўных праграм па будаўніцтве аграгарадкоў і развіцці малых і сярэдніх гарадоў, меншасць — уласнымі сіламі прадпрыемства. Вось і на 2012 год запланавана асваенне больш, чым 12 млрд рублёў на правядзенні работ па рэканструкцыі і мадэрнізацыі з уласных крыніц, больш чым 4,9 млрд рублёў — на рэалізацыю энергазберагальных мерапрыемстваў за кошт сродкаў інвестыцыйнага фонду міністэрства, каля 11 млрд рублёў са сродкаў прадпрыемства будзе асвоена на правядзенні капітальных і бягучых рамонтаў.

**— На якіх канкрэтна аб'ектах распачнуцца работы?**

— Сярод асноўных — мадэрнізацыя будынкаў транспартнага ўчастка ў Брэсце, вузлоў паштовай сувязі ў Глыбокім, дзе сёлета праводзіцца Дзень беларускага пісьменства, у Горках, дзе пройдуць рэспубліканскія «Дажынкі», у Добрушы, Асіповічах. Працягнецца рэканструкцыя транспартнага цэха ў Магілёве...

Досыць вялікі аб'ём работ чакаецца і ў сталіцы — для вытворчасці «Мінская пошта». Тут пачнецца рэканструкцыя цэха па апрацоўцы і абмене пошты. Работы плануем правесці на працягу 2012-2013 гадоў, у два этапы. Першы — гэта выкананне ўсіх будаўнічых работ, другі — устаноўка і запуск новага абсталявання. Усе работы будуць праводзіцца, што называецца, без высялення, што, на жаль, ускладніць працу і нашым будаўнікам, і працаўнікам названага цэха. Аднак рэканструкцыя даўно наспела, адкладваць яе нельга, бо на апрацоўцы пошты працуе з улікам шматзменнасці больш за 150 чалавек, у пераважнай большасці жанчын, і палепшыць умовы іх працы, вядома ж, трэба. Пры planаванні і правядзенні ўсіх будаўнічых работ мы ў першую чаргу думаем пра людзей: і тых, хто прыходзіць да нас, каб атрымаць пэўныя паслугі, і тых, хто працуе.

**— Абсалютнай большасці іх, тых, хто працуе (прынамсі, з пункту погляду кліентаў), як падаецца, грэх скардзіцца на ўмовы, бо яны досыць камфортныя...**

— Гэта, калі можна так сказаць, вынікі выканання дзяржаўнай праграмы па энергазберажэнні. Складнікаў яе шмат: тут і рэканструкцыя аконных блокаў з усталяваннем шклопакетаў, і тэрмарэнавацыя (уцяпленне сцен будынкаў), і замена дахавых пакрыццяў, цеплатрас, неэканамічных катлоў на больш эфектыўныя...

Выкананне гэтых работ дазваляе дабіцца пэўных поспехаў — зэканоміць рэсурсы. Прычым, скажам так, не разава, бо правёўшы адпаведныя мерапрыемствы, уклаўшы грошы, эканамічны эфект мы будзем атрымліваць на працягу ці не ўсёй эксплуатацыі збудаванняў. Але ж гэта — другі бок медаля. На першым — зноў жа людзі, бо і для працаўнікоў прадпрыемства, і для нашых кліентаў у выніку ствараюцца больш камфортныя ўмовы — для працы, для атрымання паслуг.

Сёлета, дарэчы, распачнецца капітальны рамонт трох аддзяленняў сувязі ў Мінску — 131, 14, 128, аднаго ў курортным пасёлку Нарач... Правядзенне работ, ну вядома ж, створыць пэўныя нязручнасці (на нейкім этапе), але ж потым, што не раз назіралі пры здачы аб'ектаў, яны стакроць кампенсуюцца — і ў сельскай мясцовасці, дзе пошта яшчэ і месца стасункаў, і ў гарадах. У першым квартале, прынамсі, у Мінску да паслуг навасёлаў адкрываюцца два аддзяленні паштовай сувязі — 52-е ў мікрараёне Міхалова і 45-е ў мікрараёне Дружба. На гэты год плануем яшчэ два наваселлі ў мікрараёнах Сухарава і Чырвоны Бор. Абсталяваць іх стараемся адпаведным чынам — гэта значыць, па апошнім слове тэхнікі.

**— І пры гэтым працу аператараў паштовай сувязі, паштальёнаў (прадстаўнікоў асноўных прафесій прадпрыемства) лёгкай не назавеш.**

— Так. У паштальёнаў, асабліва сельскіх, свае складанасці, у аператараў — свае.

У першых — гэта адлегласці, якія трэба штодзень пераадольваць, прычым у любое надвор'е, у другіх — дзясяткі паслуг, кожную з якіх трэба ведаць і прадстаўляць, прычым бездакорна правільна, ветліва, хутка. Таму наш аператар, бяруся сцвярджаць, гэта ў пэўнай ступені унікум. Да таго ж ён працуе па прынцыпе «аднаго акна», у якім, калі можна гэтак сказаць, прымаюцца ўсе віды плацяжоў, аказваецца ўвесь комплекс паслуг, якія патрэбны кліентам. Наша прадпрыемства, ну вядома ж, зацікаўлена ў тым, каб абслугоўваць іх на самым высокім узроўні. Для многіх, дарэчы, стала прывычным, прычым не толькі ў сталіцы, але і ў абласных, раённых цэнтрах, атрымліваць шэраг паслуг самастойна без дапамогі аператара, для чаго арганізавана і пастаянна пашыраецца сетка плацежна-даведачных тэрміналаў, больш якаснаму абслугоўванню спрыяюць электронныя чэргі. Іншымі словамі, пошта заўсёды ішла і ідзе ў нагу з часам, з кліентам. Так што вельмі запатрабаваныя і нашы плацежна-даведачныя тэрміналы, і інтэрнэт-крама... Пошта стараецца апраўдаць свой дэвіз «Хуткасць, надзейнасць, даступнасць», але яна не манапаліст — кліент сёння мае магчымасць выбару і выбірае...

**— Многія ведаюць гэта па сабе, бо аддзяленні сувязі часцяком знаходзяцца паблізу, а то і ў адным будынку з так званай ашчаднай касай. А таму заўсёды ёсць магчымасць убачыць і тое, дзе меншая чарга, і тое, наколькі прафесійна працуюць аператары, каб ужо потым, зыходзячы з убачанага, выбраць месца, дзе будзеш аплачваць за камунальныя паслугі, тэлефон, страхоўку...**

— Нам хочацца, вядома ж, каб гэты выбар быў на карысць пошты, таму для сваіх людзей мы імкнёмся стварыць камфортныя ўмовы не толькі на працы, дзе, як вы заўважылі і ўтульна, і цёпла, і ёсць абсталяваныя (халадзільнікам, мікрахвалевай печчу, чайнікам і г.д.) пакоі для адпачынку, для прыёму ежы, але і па месцы жыхарства. РУП «Белпошта», на вялікі жаль, не мае магчымасці істотна дапамагаць сваім працаўнікам у вырашэнні жыллёвай праблемы, што безумоўна ж, прываблівала б кадры, замацоўвала іх на прадпрыемстве. Аднак на балансе прадпрыемства ёсць інтэрнаты ў Віцебскім, Гомельскім і Гродзенскім філіялах, два — у Мінску. Усе яны ў добрым стане. А адзін са сталічных, па вуліцы Кульман, у рамках конкурсу, які праводзіўся сярод рабочых інтэрнатаў Савецкага раёна, прызнаны адным з лепшых — заняў ганаровае трэцяе месца. Гэта гаворыць пра тое, што, і выхаваўчая работа, і арганізацыя побыту знаходзіцца там на належным узроўні.

На гэты год запланавана замена ліфтаў у нашых сталічных інтэрнатах. А наогул мы імкнёмся ў належным парадку падтрымліваць усе памяшканні, асабліва так званага агульнага карыстання.

**— У гэткім жа належным стане, трэба разумець, і базы адпачынку, якія належаць прадпрыемству?**

— Так. У нас іх некалькі. Не так даўно пасля капітальнага рамонту адкрылася наша «Дружба». Цяпер там утульныя пакоі з усімі выгодамі. Да таго ж гэта ў лесе, у вельмі маляўнічым куточку непадалёк ад Мінска, і ўсяго за 30 % кошту пуцёўкі (70 % прадпрыемства бярэ на сябе)... Таму амаль круглы год база адпачынку запоўнена (хіба зімой бываюць вакансіі). Практыкуюцца на «Белпошце» і спартыўныя мерапрыемствы, выезды выхаднога дня, карпаратывы — у тым ліку і для старонніх арганізацый. Іншымі словамі, «Дружба» запатрабаваная.

Ёсць базы адпачынку і ў гродзенскім філіяле, у брэсцкім. Яны невялічкія, але і там створаны ўсе ўмовы для адпачынку людзей. Без гэтага па цяперашнім часе, як я лічу, нельга разлічваць на высокую аддачу і эфектыўную працу.

Дзеючыя асобы

## ПРЫЙСЦІ І ЗАСТАЦЦА. На ўсе жыццё...

**Месяц таму споўнілася 40 гадоў, як Лідзія Мікалаеўна Кароль працуе на пошце, але яна пра тое нават не заікнулася. Такі ўжо чалавек: вельмі сціплы, адказны, працавіты. «А яшчэ надзвычай стрыманы, карэктны, уважлівы і добразычлівы, — так пра Лідзію Мікалаеўну сказала дырэктар Брэсцкага філіяла прадпрыемства «Белпошта» Валянціна Пух. — Яна ніколі не павысіць голасу, не выльe на навакольных негатыўныя эмоцыі, у любой спрэчцы знойдзе аргументы разумныя, лагічныя, выкладзе іх спакойна і пераканаўча». Гэта вельмі важна для работніка, які займае кіруючую пасаду. А Лідзія Кароль ужо шмат гадоў працуе намеснікам начальніка Іванаўскага раённага вузла паштовай сувязі.**

І ў райцэнтры, і ў сельскай мясцовасці яе добра ведаюць. У Псышчаўскім сельсавеце, дзе давялося быць падчас гэтай камандзіроўкі, пра намесніка начальніка раённай пошты адазваліся з вялікай пашанай. Значыць, ёсць за што.

На пошту Лідзія Кароль прыйшла чатыры дзесяцігоддзі таму аператарам. Потым працавала ў сельскіх аддзяленнях сувязі, на розных участках, у тым ліку і начальнікам. Асноўныя этапы вытворчасці прайшла і ў раённым звяне, адукацыю пры гэтым атрымала завочна. Так што ўсю работу свайго ведамства ведае знутры. «Цікава назіраць, як змяніліся формы нашай працы, — разважае Лідзія Мікалаеўна. — Цяпер мы выкарыстоўваем інфармацыйныя тэхналогіі, інтэрнэт, а не пішам рукой у сшытачку, як было 40, нават 20 гадоў таму. Як і ў вялікіх гарадах, у сябе таксама ўкараняем усё новыя і новыя паслугі, каб кліент мог хутчэй атрымаць альбо адаслаць патрэбнае адпраўленне.

Але шмат што засталося па-ранейшаму, — працягвае суразмоўніца. — І найперш праца паштальёнаў, якія ў любое надвор'е ідуць да людзей. Іх усяго ў нас працуе 76. Асабліва нялёгкая работа ў вясковых паштовых работнікаў. Яны самыя чаканыя госці жыхароў аддаленых вёсак, асабліва тых, дзе засталося два-тры чалавекі. Вось літаральна сёння тэлефануе мне 86-гадовая пенсіянерка з просьбай, каб паштальён прыносіла ёй макарону, крупы, іншыя прадукты. Вядома, у такіх просьбах мы не адмаўляем. Я ўжо папярэдзіла вясковую пошту, а кліентку папрасіла, каб яна зрабіла званок ім, яны прымуць заяўку, раскажуць, што па якой цане, дамовяцца, калі лепш прынесці прадукты».




Вясковая пошта сёння яшчэ і трошачкі сацыяльная служба. Такіх кліентаў, як згаданая бабулька, многа. У раёне зараз два сельскія паштовыя аддзяленні нерэнтабельныя. Яны і не могуць быць такімі, бо ў зону абслугоўвання ўстаноў у Баландзічах і Асаўніцы ўваходзіць недзе па 200 чалавек. Падобныя пытанні цяперашнім часам вырашаюцца вядома як — установа закрываецца. Але людзі супраць, яны просяць, каб хоць пошту, апошняе іх акно ў вялікі свет, не зачынялі. Ну і пакуль трымаюцца, рэнтабельнасць выраўноўваецца за кошт іншых, буйных, аддзяленняў.

Сапраўды, як закрыць пошту ў вёсцы, калі ў названых Баландзічах, а таксама Ляскавічах, Дастоеве апроч іншага там прадаецца свежы хлеб, а старым адзінокім, нямоглым і паштальён іншы раз бохан занясе.

Зараз адным з галоўных клопатаў Лідзіі Кароль і яе калег стала падпіска на перыядычныя выданні. Ёсць пэўныя складанасці сёлетняй кампаніі. З падаражаннем жыцця людзі сталі больш уважліва лічыць кожную капейку. «Але ж расказваем, паказваем на прыкладах, колькі каштуе любімае выданне ў параўнанні з кілаграмам каўбасы ці іншым прадуктам, — гаворыць Лідзія Мікалаеўна, — часта спрацоўвае. Пастаянныя падпісчыкі, якія яшчэ вагаліся, робяць выбар на карысць перыёдыкі».

Дарэчы, сама яна даўні і шчыры сябар нашай газеты. Чытае «Звязду», як аказалася, шмат гадоў. І любіць яе, як прызналася, за шчыры душэўны тон, за роднае слова. А яшчэ любіць свой родны горад, які ў апошнія гады значна папрыгажэў. Ганарыцца, што мясціны, дзе яна нарадзілася і вырасла, звязаны з імёнамі славутых людзей. У райцэнтры стаіць помнік Напалеону Ордзе, на яго малой радзіме створаны музей. А цяпер актыўна загаварылі пра магчымае адраджэнне былой сядзібы роду Дастаеўскіх. «У нашым горадзе вельмі прыемна прымаць гасцей, ёсць пра што расказаць, што паказаць», — заўважае Лідзія Кароль. А сама яна прыкладна раз на год бывае ў курортным Геленджыку Краснадарскага краю. Там жыве старэйшая дачка. Як заедзе Лідзія Мікалаеўна ў цёплы марскі горад, то абавязкова зойдзе на пошту, пацікавіцца, як калегі працуюць. Кажа, што ў расійскіх паштавікоў прыкладна такія ж праблемы і клопаты, як у нас. Адзінае, у іх больш распаўсюджаны пасылкі з накладной платай. Многія фірмы так ажыццяўляюць гандаль сваімі таварамі: адзеннем, посудам, касметыкай. Але і ў нас апошнім часам такая форма паслуг — не навіна.

Год кнігі

## КНІЖНАЯ ЕЛКА Ў «СЯБРЫНЕ»

### У краме «Брэстаблсаюздрука» працуе выстава-продаж дзіцячай кнігі

**Новую прасторную краму «Сябрына» прадпрыемства «Брэстаблсаюздрук» адкрыла тры гады таму. І з першага дня тут гандлявалі кнігамі. Сёння ў зале побач з асноўным таварам — перыёдыкай — таксама вельмі прыстойны выбар кніг. Менавіта ў гэтым гандлёвым пункце нарадзілася ідэя праводзіць выставы-продажы літаратуры. Тым больш што крама мае сваю канферэнц-залу, якую і вырашылі скарыстаць у перапынках паміж мерапрыемствамі.**

Першая выстава называлася «Кнігі па даступных цэнах». Тады якраз атрымалі некалькі партый тавару з Масквы без пасрэднікаў. Вось і стала магчымым зрабіць цэны даступнымі. Намеснік начальніка аддзела арганізацыі гандлю Ала Бахарава расказвае, што перад першай выставай вельмі хваляваліся: час масавага набыцця «літаратуры» прайшоў, сапраўдным ворагам кнігі стаў інтэрнэт. Безумоўна, на сённяшнюю сітуацыю паўплывала таксама змена грамадскіх каштоўнасцяў. І як жа былі рады памыліцца! Кніжкі з першай выставы разышліся літаральна «на ўра». З'явіўся свой пакупнік. Навінкамі выдавецтваў цікавіліся пераважна небагатыя інтэлігентныя людзі. З часам яны сталі пастаяннымі наведвальнікамі крамы. Паводле слоў Алы Бахаравай, ёсць нетаропкія ўдумлівыя пакупнікі, якія ля стэлажоў праводзяць гадзіны, старанна вывучаюць асартымент, а потым робяць пакупку.

І вось напярэдадні навагодніх і калядных святаў вырашылі правесці яшчэ адну выставу. Па ініцыятыве дырэктара «Брэстаблсаюздрука» Васіля Марэйкі яе назвалі «У гасцях у казкі». Нават тэлевізар прынеслі ў залу з дырэктарскага кабінета, каб юныя наведвальнікі маглі паглядзець свае любімыя мультфільмы. А елку тут умудрыліся зрабіць эксклюзіўную — з кніг. Шматпалічны стэлаж, падобны на этажэрку, разгарадзілі кардонкамі і запоўнілі кнігамі так, што канструкцыя стала нагадваць галіны дрэва. Такой елкі дакладна больш нідзе не знойдзеш.

У зале ёсць буфет, дзе можна набыць шакаладку, пячэнне, цукеркі, замовіць чай ці каву, пасядзець за столікам, пачаставацца. Ёсць магчымасць купіць салодкі падарунак, калі, скажам, бацькі прыйдуць з дзецьмі і трапяць на казачнае прадстаўленне ў 15 гадзін. У гэты час кожны дзень да юных наведвальнікаў выходзяць Дзед Мароз са Снягуркай.

А ўсяго на выставе гледача і пакупніка чакаюць больш за 600 найменняў кніг беларускіх і расійскіх выдавецтваў. Шмат літаратуры пазнавальнага, навукова-папулярнага характару. Шырока прадстаўлены энцыклапедыі пра жывёл і птушак, розныя з'явы прыроды. Ёсць кнігі са спецыяльнымі акулярамі, у фармаце 3D. Парадаваў выбар і беларускай літаратуры: «Малая дзіцячая Чырвоная кніга» Віктара Гардзея, «Казкі астранаўта» Раісы Баравіковай, «Як Алік у тайзе заблудзіўся» Уладзіміра Дубоўкі, а таксама кнігі з серыі «Зямля мая», маляўнічыя зборнікі казак прыцягнулі ўвагу на першым жа стале-стэндзе.

Паколькі выстава ўсё ж арыентавана на пакупніка дзіцячага ўзросту, аўтары яе прадугледзелі конкурсы, віктарыны, розныя забаўлянкі і акцыі. Таму, хто набывае, напрыклад, тавар больш як на 60 тысяч рублёў, уручаецца прыз. Тут, дарэчы, можна купіць цацку, розныя гульні, зборныя мадэлі самалётаў ды іншай тэхнікі. Але прадаўцы стараюцца пераканаць наведвальнікаў, што лепшы падарунак — кніга. Выстава працягнецца да канца студзеня.




Прадавец Ніна Астапенка паказвае кніжкі.

Пытанне з канверта

## КАГО МЫ ЗДЗІВІМ ЯЛІНКАМІ?

**Вельмі імклівы час... У стасунках паміж людзьмі, цяпер, як здавалася б, усяго і засталося, што тэлефон, інтэрнэт... А калі паштоўка — дык ужо з гатовымі тэкстамі: нейкімі (і часта, на жаль), нязграбнымі, бездапаможнымі вершамі.**

Мне асабіста такія віншаванні заўсёды здаваліся безаблічнымі, халоднымі. Іншая справа — ліст альбо паштоўка, напісаныя дарагой рукой. І звычайнай ручкай.

Менавіта на іх цяпер пачалася мода на Захадзе, менавіта яны, вось гэтыя лісты і паштоўкі, сталі лічыцца найлепшым падарункам.

Гэта, магчыма, ад настальгіі, а магчыма ад таго, што ў гэтай «старамоднасці» ёсць чалавечае цяпло, ёсць павага да адрасата, нейкая свая энергетыка. Я асабіста заўжды ўдзячна, калі нехта падараваў мне свой час, свае думкі і меркаванні. Ды і ці я адна?

Мы ведаем, як шмат беларусаў жыве за межамі краіны. Толькі ў Маскве іх (афіцыйна) больш за 60 тысяч! І абсалютная ж большасць — прынамсі з маіх сяброў — не парывае сувязі з радзімай.

Так, найчасцей яна тэлефонная, камп'ютарная, але ж пісьмы ідуць таксама. Таму, адсылаючы іх за межы Беларусі, цудоўна разумееш, што адрасат зверне ўвагу на ўсё, у тым ліку — на афармленне канверта, бо яно ж таксама нясе нейкую інфармацыю пра нашу краіну. Там, прынамсі, пазначаюцца юбілеі самых выдатных землякоў, памятныя даты, гістарычныя падзеі, архітэктурныя адметнасці, гарады...

І тут трэба аддаць належнае нашай «Белпошце»: выбар канвертаў заўсёды найбагацейшы. А вось з паштоўкамі, як мне здаецца, праблема існуе.

Што я маю на ўвазе?

У турыстаў, што прыязджаюць да нас з Еўропы, ёсць завядзёнка, традыцыя абавязкова адасланць паштоўку сваім блізкім і тым самым засведчыць яшчэ адну «кропку» на карце свету, дзе яны пабывалі. Такія паштоўкі ў сем'ях свята захоўваюцца і, як правіла, заўсёды дэманструюцца — дзецям, гасцям. Але ў нас, нават у Мінску, цяжка выбраць і набыць паштоўку з відамі сталіцы, іншых адметных мясцін (падкрэслю) *з адпаведнай маркай*. Для гэтага трэба ехаць на Галоўпаштамт.

Цікавы, карысны праект — кірмашы віншавальных паштовак і канвертаў напярэдадні вялікіх свят. Выбар там сапраўды шырокі — нават з улікам канфесійных асаблівасцяў. Але апошнія два гады я, на вялікі жаль, не змагла (можа, мне не пашчасціла?) набыць віншавальныя паштоўкі да Каляд і Новага года менавіта з беларускім каларытам. Ялінкі, Дзяды Марозы, Снягуркі — гэта, згадзіцеся, нешта для ўсіх агульнае, хаця і вельмі прыгожае. А тым жа замежным сябрам, сваякам хацелася б даслаць нешта незвычайнае, уласцівае толькі нам, беларусам. Магчыма, гэта будуць нашы пазнавальныя архітэктурныя адметнасці, магчыма — святкаванне Каляд у розных рэгіёнах краіны... Усё гэта можна адпаведным чынам афарміць, аздобіць. І досвед такі ў нас быў, бо ёсць жа чым ганарыцца! Да таго ж, як мне думаецца, падобныя паштоўкі сталі б яшчэ і свайго роду візітоўкамі нашай краіны, запрашэннем наведаць яе, пабачыць усё на ўласныя вочы.

**А. БАЛОШКА,** *г. Мінск.*

## Пасябруем з усім светам?

**Вы хочаце калекцыянаваць прэзенты з розных гарадоў свету? Вам прыемна было б атрымаць прывітанне з Сінгапура, Нідэрландаў, Аўстраліі, Тайваня, Амерыкі, альбо перадаць вестачку каму-небудзь у Кітаі, Амерыцы, Бразіліі? Зусім не абавязкова мець там сяброў. Варта толькі далучыцца да аматараў пасткросінгу, і вы зможаце атрымліваць паштоўкі з розных куткоў свету. Прычым вашы выдаткі на такія кругасветныя падарожжы і знаёмствы будуць роўныя толькі кошту паштовак, якія вы будзеце адпраўляць.**

Пасткросінг (абмен паштоўкамі) узнік 6 гадоў таму. І сёння да гэтага хобі далучылася больш за 200 тысяч чалавек з 205 краін свету. Каля 700 паштовак у гадзіну выпраўляецца ў падарожжа. Некалькі мільёнаў паштовак ужо знайшлі сваіх адрасатаў.

Праз інтэрнэт аматары пасткросінгу дзеляцца сваімі поспехамі, выкладаюць фотаздымкі сваіх калекцый. Дарэчы, вы таксама можаце ўцягнуцца ў такое хобі. Гэта неблагі шанс абзавесціся сябрамі, даведацца нават пра такія гарады, пра якія вы ніколі і не чулі, расказаць пра сябе і сваю краіну.

Трэба толькі зарэгістравацца на сайце http://www.www.postcrossing.com/. Тут жа вы атрымаеце адрасы, па якіх чакаюць паштовак гэткія ж аматары сапраўднай пошты. Адрасат, які атрымлівае паштоўку, рэгіструе яе, і цяпер застаецца чакаць прыемнага сюрпрызу. Вашы каардынаты перадаюцца наступнаму аматару пасткросінгу. Прычым, з якой краіны да вас прыйдзе паштоўка — заўсёды сюрпрыз. Адрасы на сайце перадаюцца пасткросерам выпадковым чынам. Пошту можна чакаць нават з Батсваны, Сальвадора, Гандураса ці Палінэзіі. Ды і напісаць вам можа чалавек якога заўгодна ўзросту, прафесіі, веравызнання. Да сусветнага паштовага руху далучаюцца як дзеці, так і людзі ў паважаным узросце. Па статыстыцы сёння большасць аматараў гэтага хобі — жанчыны.

Дарэчы, калі вы ўжо калекцыянуеце нейкія паштоўкі, можаце пазначыць, якім вы аддаяце перавагу. Напрыклад, некаторыя пасткросары збіраюць паштоўкі з выявамі гарадоў, адкуль тыя прыходзяць, іншым больш падабаюцца жывёлы. Ёсць шанс атрымаць і святочныя паштоўкі, напрыклад, да Новага года ці Хэлоўіна. І трэба заўважыць, што беларускія пасткросары сёння з'яўляюцца аднымі з самых актыўных. Многія ўжо маюць у сваіх калекцыях больш за сотню паштовак з розных краін свету.

Між іншым, разам з паштоўкамі вы можаце атрымліваць і канверты, маркі. І як адзначаюць пасткросары, ёсць пэўная асалода нават проста ў тым, каб разглядаць маркі і надпісы на розных мовах свету. Больш за тое, гэта хобі спрыяе таму, каб людзі адрываліся ад канап і тэлевізараў: шмат часу можа пайсці на пошук паштовак. Асабліва калі трэба парадаваць, напрыклад, «калегу» з Кітая, які калекцыянуе паштоўкі менавіта з таксамі. Прычым беларускія аматары пасткросінгу заўважаюць, што, каб займець такое хобі, зусім не абавязкова быць паліглотам, пісаць можна на любых мовах. Затое валоданне, напрыклад, англійскай мовай дадае пэўныя перавагі — так вы зможаце распавесці пра сябе, прачытаць пасланне, а то і ўступіць у перапіску з новымі замежнымі знаёмымі.

Калі раней айчынныя пасткросары сутыкаліся з праблемай выбару паштовак, якія не сорамна адправіць за мяжу, то сёння многія заўважаюць, што выбар паштовак для пасткросінгу стаў значна большым. Сёння паштоўкі з відамі гарадоў і прыгожых мясцін Беларусі можна набыць у кнігарнях, але і ў аддзяленнях сувязі РУП «Белпошта».

## Чытанка на месяц

### «ПОЛЫМЯ», № 1, 2012

«Хлеб і соль» — такой назвай можна паяднаць вершы Міколы Мятліцкага і нататкі Алеся Марціновіча, прысвечаныя паездцы беларускіх пісьменнікаў па краіне, што адбылася па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі.

У студзеньскім нумары друкуюцца лісты Уладзіміра Ліпскага да ўнука «Адкрый сябе», аповесць Таццяны Пяшко пра сучасную школу «Выпраўленне памылак», апавяданні Галіны Васілеўскай, Юліі Зарэцкай, Аляксея Якімовіча.

З вершамі выступаюць паэты Віктар Шніп, Міхась Пазнякоў, Мікола Чарняўскі.

Крытыка і літаратуразнаўства прадстаўлена нататкамі Таццяны Шамякінай пра творчасць Алеся Савіцкага, рэцэнзіямі на новыя кнігі. «Школьныя даляглядны» правялі ўрок радыялагічнай бяспекі ў Астраўцы, дзе ідзе будаўніцтва першай беларускай АЭС. Наталля Міцкевіч згадвае сваю «доўгую дарогу» ад дома Янкі Маўра да дома Якуба Коласа. Людміла Іконнікава шукае хрысціянскія матывы ў творчасці Георгія Марчука.

### «НЁМАН» №1

Пачынае першы нумар года раман Георгія Марчука «Год дэманаў». Друкуюцца таксама апавяданні Веры Зелянко і фантастычная аповесць Генадзя Аўласенкі «Перайсці праз мяжу». Паэзія прадстаўлена вершамі Міхася Пазнякова, Надзеі Чмары, Юрыя Арэстава, а таксама творамі ўдзельнікаў нарады маладых пісьменнікаў Андрэя Чапялюка, Юліі Куранковай, Надзеі Новікавай, Таццяны Шылавай.

«Сусветная літаратура ў «Нёмане»» змяшчае кароткія апавяданні-абразкі італьянскага празаіка Джуліяна Скабіа, вершы Габрыэля Раверы.

Да 130-годдзя Якуба Коласа змешчаны лісты класіка беларускай літаратуры да перакладчыка, з якім ён супрацоўнічаў шмат гадоў.

У раздзеле «Дакументы. Запіскі. Успаміны» друкуюцца лісты Вячаслава Адамчыка. Пад рубрыкай «Эпоха. Лёс. Памяць» можна прачытаць артыкул доктара гістарычных навук Э. Ёфе «Рукатворныя помнікі Лангбарда» і лісты вядомага архітэктара, падрыхтаваныя да друку Г. Шостак.

Літаратурная крытыка прадстаўлена артыкулам Георгія Кісялева «Цаглінай па Пушкіну».

«Культурная прастора» знаёміць чытачоў з папулярным спеваком беларускай эстрады Валерыем Дайнекам.

### «МАЛАДОСЦЬ» № 1

У студзеньскім нумары «Маладосць» прэзентуе новую аповесць Алены Брава «Рай даўно перанаселены». Андрэй Голуб дэбютуе з кароткім апавяданнем «Хірург». Пісьменнікі Дзмітрый Пятровіч і Таіса Супрановіч прадстаўляюць сучасную прозу старэйшага пакалення.

Упершыню ў «Маладосці» апублікавана яркая вершаваная падборка Максіма Баравіка, сябра літаратурнага гуртка «Альтанка», што працуе пры філалагічным факультэце БДУ пад кіраўніцтвам Ірыны Багдановіч. Паэзія Алесі Кузьміновай і Юрася Шамецькі выяўляе найноўшую канцэптуальную беларускую літаратуру. Вершы Цыпрыяна Норвіда — унікальнага паэта эпохі Рамантызму, сучасніка Адама Міцкевіча — перакладзеныя з польскай мовы на беларускую Паўлам Надольскім. Чакае чытачоў працяг «Радзівіліяды» — лацінамоўнага беларускага гераічнага эпасу, ператворанага Жаннай Некрашэвіч-Кароткай.

Беларуска-кітайскім культурным узаемасувязям прысвечаны матэрыялы Навума Гальпяровіча, Таццяны Сівец, Ірыны Клімковіч, Кастуся Ладуцькі. З першага нумара «Маладосць» распачынае цікавы праект — знакі літаратурнага задыяка. Мікола Кандратаў складае гараскопы класікаў айчыннага прыгожага пісьменства. Першы з іх прысвечаны Адаму Міцкевічу, які нарадзіўся ў студзені. Рубрыку студэнцкага гумару прадстаўляе Пятро Васючэнка.

Завяршаюць «Маладосць» старонкі для школьнікаў — з новага года да выдання далучыўся часопіс для падлеткаў «Бярозка».


Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі: У. ЗДАНОВІЧ, В. ДОЎНАР, С. ЯСКЕВІЧ, І. ЛАПАТО.

Зорная пляцоўка

# Анастасія Ціхановіч: пра сябе, пра сям'ю і пра «Еўрабачанне»



**У дзяцінстве маленькая Насця, вядома ж, ведала, што яе бацькі — не абы-хто, а вядомыя ва ўсім Саюзе эстрадныя артысты Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч. І як ва ўсіх эстрадных сем'ях — цыркавых, тэатральных, акцёрскіх, — у музычнай сям'і Ціхановічаў для дзіцяці была радасць, калі тата з мамай вярталіся з гастроляў дадому. Час ад часу дзяўчынку бралі з сабой. Насця і сёння памятае, як на вялікіх фестывалях, каб асабліва не замінаць бацькам-артыстам, яны разам з маленькай Алесяй Ярмоленка бавіліся за сцэнай, прыдумляючы сабе гульні...**

Прайшоў час. Здарылася тое, што звычайна і здараецца ва ўсіх эстрадных сем'ях, калі дзеці ідуць па шляху бацькоў: Насця стала спявачкай. Пра сваё дзяцінства, шлях у музыку і статус «дачкі народных артыстаў» Анастасія Ціхановіч распавяла «Звяздзе».

## Я ХАЦЕЛА ПРАЦАВАЦЬ У «ЮРЫСТЫЧНАЙ КАНСУЛЯЦЫІ»

— У дзяцінстве ў мяне было насамрэч шмат варыянтаў адносна маёй будучай прафесіі. Як і ў майго сына, які перайшоў сёлета ў другі клас. Ён хоча быць то стаматолагам, то лётчыкам, то кімсьці яшчэ. Я цудоўна памятаю сваё дзяцінства. У нашай сям'і была знаёмая, якая працавала юрыстам. Гэта была прывабная жанчына, строгая, элегантна апранутая. І мне здавалася, што гэта так цікава — быць юрыстам, быць такой жа дзелавой і хвацкай. Таму я заўжды ўсім казала, што буду працаваць у «юрыстычнай кансуляцыі» — так я тады называла юрыдычную кансультацыю.

Музыкай я пачала займацца з чатырох гадоў. Паступіла ў музычную школу, затым у Рэспубліканскі каледж мастацтваў імя Ахрэмчыка, дзе шмат увагі надавалася музыцы. Пазней мне было ўжо цяжка ўявіць сябе дзесьці, акрамя музыкі і мастацтва. Магчыма, менавіта таму я і выбрала для сябе Інстытут сучасных ведаў, факультэт мастацтваў, спецыяльнасць — культуролаг, менеджар-прадзюсар.

**— Для нас Аляксандр Ціхановіч і Ядвіга Паплаўская — гэта артысты. Для вас жа яны найперш бацькі. Як жылося дачцэ народных артыстаў?**

— Трэба разумець, што вельмі часта іх сапраўды не было дома. Таму любая з імі сустрэча была, хутчэй, святочным момантам. Святочным, таму што я дакладна ведала: з кожнай паездкі мне прывязуць які-небудзь падарунак (*усміхаецца.* — **Аўт.**). У тыя моманты, калі я хадзіла ў школу, я жыла з бабулямі і цёткай — якія мяне збольшага і выхоўвалі.

Калі прыходзіў летні час, тата з мамай бралі мяне на ўсе вялікія гастролі — для пашырэння кругагляду дзіцяці гэта было вельмі карысна. Я ўбачыла свет — іншыя гарады, іншыя краіны — той жа Паўднёва-Сахалінск (*усміхаецца.* — **Аўт.**).

Убачыла, як працуюць артысты ў экстрэмальных умовах — напрыклад, замаўлялі верталёт, таму што кудысьці з населеных пунктаў нельга было дабрацца звычайным спосабам. Ляцелі ў глухую мясцовасць, каб падарыць людзям свята. Мне такія назіранні шмат чаго далі. Сёння артыстам падабаюцца вялікія залы, дзе шмат народу і выдатная тэхніка. Мне ж таксама даспадобы выступаць і дарыць момант свята і тым людзям, у якіх няма магчымасці кожны дзень хадзіць на канцэрты, людзям, для якіх сустрэча з артыстам — свята. Выступаць перад такой публікай — адчуванне творчай радасці.

**— Мне вось цікава, ці спяваюць у такой музычнай сям'і дома або пакідаюць гэты занятак толькі для сцэны?**

— Спяваць — гэта стан душы. У нас пастаянна нехта ходзіць і нешта спявае (*усміхаецца.* — **Аўт.**). Калі казаць пра сямейныя запевы, то заўсёды, калі мы збіраемся ў маёй бабулі — яна полька па нацыянальнасці, — візіт заканчваецца тым, што яна пачынае спяваць песні. Яна шмат чаго памятае ў свае 91. Мы ж традыцыйна спяваем ёй «Сто лят», гэтак жа традыцыйна можам праспяваць «Многая лета». У нас на галасы прыгожы акорд атрымліваецца (*усміхаецца.* — **Аўт.** ). Калі няма магчымасці павіншаваць сяброў сям'і асабіста, то мы можам на тры галасы праспяваць у тэлефон тое ж «Многая лета» ці «Сто лят». Спадзяюся, атрымаць такое музычнае віншаванне прыемна.

## ПРАЦА І БАЦЬКІ

**— Сёння вы спалучаеце артыстычную дзейнасць з выкладаннем у Інстытуце сучасных ведаў. У чым заключаецца ваша праца?**

— Я чытаю лекцыі для студэнтаў спецыяльнасці «Менеджар-прадзюсар у сферы мастацтваў». Я з самага пачатку папярэджваю іх пра тое, што гэта нават не столькі прафесія, колькі ў некаторай ступені стыль жыцця, якому трэба ўдзяляць шмат увагі. Трэба жыць сваімі праектамі — не важна, што гэта за праекты і ў якой сферы культуры і мастацтва яны будуць рэалізоўвацца. Яны добрыя толькі тады, калі ты сам захоплены ідэяй гэтага праекта.

Прадзюсарства — дзейнасць больш практычная, чым тэарэтычная. Зыходзячы са свайго практычнага вопыту, я стараюся падзяліцца са студэнтамі тымі нюансамі, якія яны не знойдуць у падручніках — тым больш у дачыненні да беларускай шоу-індустрыі. Тое, да чаго я іх заклікаю, — каб ужо будучы студэнтамі, яны ішлі і спрабавалі сябе дзесьці. Асабіста я, калі была студэнткай, так і рабіла.

**— Знакамітасць вашых бацькоў была ўсё ж плюсам ці мінусам у вашай кар'еры?**

— Калі незнаёмы нам чалавек дзякуючы сваім намаганням чагосьці дасягае, мы за яго шчыра радуемся і спагадаем яму. Чаму вы думаеце, зараз так папулярныя розныя талент-шоу, кшталту «Фабрыкі зорак» ці «Народнага артыста»? Бо кожны бачыць у гэтых нікому не вядомых людзях сябе. У маёй сітуацыі ўсім чамусьці здавалася, што сцэну мне прынеслі на сподку з блакітнай аблямоўкай... Гэта далёка не так.

> **«Так, мае першыя песні былі спрадзюсаваны мамай, якую я ўвогуле лічу адной з найлепшых у вобласці музычнага мастацтва. Падчас запісу маіх першых песень мы з мамай старанна працавалі над удасканаленнем кожнай ноты, кожнага гуку ў маім вакале. Гэта была вельмі карпатлівая праца. Але пасля гэтага я назаўсёды зразумела, як трэба працаваць».**

Так, мае першыя песні былі спрадзюсаваны мамай, якую я ўвогуле лічу адной з найлепшых у вобласці музычнага мастацтва. Яна скончыла Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі двойчы: адзін раз — як піяністка, другі раз — як кампазітар, вучылася ў Яўгена Глебава. На пачатку творчага шляху артысту вельмі неабходна аб'ектыўная крытыка і аўтарытэтнае меркаванне. Падчас запісу маіх першых песень мы з мамай старанна працавалі над удасканаленнем кожнай ноты, кожнага гуку ў маім вакале. Гэта была вельмі карпатлівая праца. Але пасля гэтага я назаўсёды зразумела, як трэба працаваць.



Насця з мамай Ядвігай Паплаўскай.

Фота з сямейнага архіва А. ЦІХАНОВІЧ.

Магчыма, збоку гэта адпаведна і выглядае: маўляў, ёсць хтосьці, хто сваім імем і аўтарытэтам дапамагае табе, прабівае дарогу, але, калі быць шчырым, у рэальнасці ўсё не так. Усе ад цябе чагосьці чакаюць, нібыта ты павінен зрабіць так, каб усе здзівіліся. Я ж нікому нічога не павінна. Таму размовы пра нейкае там лабіраванне ці прасоўванне не маюць пад сабой глебы. Паверце, калі б усё было так, як кажуць, мае справы як спявачкі ішлі б нашмат лепш (*усміхаецца.* — **Аўт.**).

## ПРА УДЗЕЛ У «ЕЎРАФЭСЦЕ» ГАВАРЫЦЬ НЕ СПЯШАЮСЯ

**— На Белтэлерадыёкампаніі вы працуеце выканаўчым прадзюсарам праекта «Еўрафэст». Няўжо Вам ніколі не хацелася таксама падаць сваю заяўку на конкурс?**

— Кухня «Еўрабачання», у тым ліку і працэс адбору, мне вядомыя знутры. Выступіць там як канкурсантцы? Пытанне неадназначнае. Я займаюся конкурсам трошкі ў іншай ролі, а ўзяць і пераключыцца на нейкую іншую ролю ў ім, — пакуль нават і часу няма. Па-першае, павінна быць добрая песня. Па-другое, максімальная канцэнтрацыя сіл. Мінімум паўгода — максімум год артыст павінен думаць толькі пра гэта і больш ні пра што.

Паказальны ў гэтым плане прыклад Дзімы Калдуна, які перад конкурсам адкінуў усе астатнія справы і быў канкрэтна нацэлены на вынік.

Падчас падрыхтоўкі неабходна шмат працаваць: трэба быць гатовым ахвяраваць часам. Па маіх сённяшніх адчуваннях — мне цікава адкрываць конкурс з арганізацыйнага пункту гледжання. Адкінуць усе астатнія справы я пакуль не магу. Таму пра свой удзел у «Еўрафэсце» як спявачкі гаварыць пакуль не спяшаюся.

**— Чаму ж? Вы ведаеце ўжо шмат з таго, як і што ад вас будзе патрабавацца...**

— Насамрэч, усё не так проста, як здаецца. Ды я ўжо і прывыкла за гэтыя гады спалучаць дзве важныя прафесійныя лініі — тэлебачанне і сцэну. Тэлебачанне стала адным з асноўных складнікаў мяне як прадзюсара — шмат гадоў я супрацоўнічаю з рознымі тэлеканаламі, пачынаючы ад «Зорнага дыліжанса» на СТБ і заканчваючы «Еўрафэстам» на БТ. Гэты расклад спраў мяне задавальняе. А што будзе заўтра — ніхто не ведае.

Для некаторых артыстаў удзел у «Еўрабачанні» — ідэя фікс. Ім здаецца, што пасля ўдзелу ў гэтым конкурсе ў іх жыцці нешта кардынальна павінна змяніцца. Сапраўды ў многіх змяняецца, але не ва ўсіх. Тут шмат залежыць як ад працы артыста, так і ад працы яго менеджменту: ці рэалізуюць яны той шанс, які ім выпадае.

> **«Для некаторых артыстаў удзел у «Еўрабачанні» — ідэя фікс. Ім здаецца, што пасля ўдзелу ў гэтым конкурсе ў іх жыцці нешта кардынальна павінна змяніцца. Сапраўды ў многіх змяняецца, але не ва ўсіх. Тут шмат залежыць як ад працы артыста, так і ад працы яго менеджменту: ці рэалізуюць яны той шанс, які ім выпадае».**

## ЦІ СТАНЕ СЫН АНАСТАСІІ ЦІХАНОВІЧ АРТЫСТАМ?

**— Пару гадоў таму беларуская грамадскасць даведалася пра юнага артыста DJ Анатоля, унука Анатоля Ярмоленкі. Ці пачуем мы пра DJ Івана, унука Аляксандра Ціхановіча?**

— Усё, чым цікавіцца мой сын, я падтрымліваю. Але ніколі нічога не навязваю. Напрыклад, яго вельмі цікавіў збор канструктара «LEGO». Я гэта падтрымлівала, пакуль не стала надта накладна (*смяецца.* — **Аўт.**). Яму вельмі падабаецца маляваць. Ёсць рэчы, займаючыся якімі, ён максімальна сканцэнтраваны. Што датычыцца музыкі, то доўгі час ён нават забараняў мне спяваць якіясьці там калыханкі. Казаў: «Мама, не спявай!» (*усміхаецца.* — **Аўт.**).

Сёлета ён пайшоў у першы клас музычнай школы (іх школа знаходзіцца побач з музычнай). Я спачатку хвалявалася, бо па сабе ведаю: заняткі музыкай патрабуюць вялікай уседлівасці — ім трэба аддаваць шмат часу. Мы вырашылі паспрабаваць: атрымаецца — так атрымаецца. Не — так не. Аднак я са здзіўленнем заўважыла, наколькі хутка ён стаў схопліваць музычную грамату. Ужо праз два тыдні музычнай школы дзіця само імправізавала ў дзве рукі на фартэпіяна. Нядаўна ў яго быў першы экзамен. Што мяне парадавала — ён не саромеецца іграць. Таму я не буду нічога загадваць, проста буду падтрымліваць у сваім дзіцяці тое, што яму цікава. Думаю, гэта правільна.

**Ілья ЛАПАТО.**

## АДНО ДРЭВА. І ЧАТЫРЫ ЛЁСЫ...

**У Пухавіцкім раёне ў выніку дарожна-транспартнага здарэння загінулі два чалавекі. Дваіх пацярпелых выратавалі работнікі МНС.**

— Пра аварыю з удзелам легкавога аўтамабіля паблізу вёскі Падгацце ўдзень у службу выратавання «101» паведаміў кіроўца машыны, што ехала міма. Ён жа сказаў, што патрэбна дапамога, каб дастаць з транспартнага сродку пацярпелых і загінулых, — расказалі ў Цэнтры даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — На месцы высветлілася, што кіроўца аўтамабіля «Сітраен Ксара-Пікаса» не справіўся з кіраваннем і аўто сутыкнулася з дрэвам. У машыне знаходзіліся чатыры чалавекі. У выніку аварыі кіроўца і адзін з пасажыраў загінулі, яшчэ двое пацярпелі. Звесткі пра ўсіх удзельнікаў дарожна-транспартнага здарэння ўдакладняюцца. Брыгадамі хуткай медыцынскай дапамогі адзін пацярпелы быў дастаўлены ў Пухавіцкую цэнтральную раённую бальніцу, другі — ва Уздзенскую.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»**
***на основании Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков» (с изменениями, вступившими в силу с 1 января 2012 г.)***
**ВНОСИТ ИЗМЕНЕНИЕ**
в опубликованное в газете «Звязда» за 30 декабря 2011 г. № 250 извещение о проведении аукциона по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Воложинского района, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, по продаже **здания цеха по производству бумажных стаканов** (инв. № 632/С-17001), расположенного по адресу: Минская область, Воложинский район, г.п. Ивенец, ул. Промышленная, 30.

**Последний абзац извещения изложить в следующей редакции:**
